Падрабязнасці

# За арганізацыю харчавання і падвоз навучэнцаў педагогаў заахвоцяць

**Пастановай Міністэрства адукацыі зацверджана Інструкцыя аб памерах, парадку і ўмовах устанаўлення надбавак педагагічным работнікам бюджэтных арганізацый.**

Як ужо паведамлялася раней, з 1 студзеня 2019 года педагагічным работнікам устанаўліваюцца надбаўкі, якія ўлічваюць галіновыя асаблівасці педагагічнай дзейнасці.

Пастанова змяшчае пералік відаў работ (функцый), за выкананне якіх устанаўліваюцца надбаўкі: у яго ўвайшлі сістэмная работа па арганізацыі харчавання навучэнцаў, іх аздараўлення, у тым ліку ў канікулярны перыяд, работа з адоранымі і таленавітымі навучэнцамі, удзел у дзейнасці вучэбна-метадычных аб'яднанняў і іншыя.

Згаданыя надбаўкі ўстанаўліваюцца ў працэнтах ад тарыфнай стаўкі першага разраду. Максімальны памер надбаўкі можа скласці 142 рублі.

Напрыклад, памер надбаўкі за сістэмную работу па абароне правоў і законных інтарэсаў дзяцей з праблемных сем'яў, дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі, можа дасягаць 200 %. За суправаджэнне навучэнцаў пры арганізацыі іх падвозу ва ўстановы адукацыі памер надбаўкі — да 150 % ад тарыфнай стаўкі першага разраду, за работу з адоранымі і таленавітымі навучэнцамі (падрыхтоўку іх да алімпіяд, конкурсаў і г. д.) — да 300 %. За ўдзел у дзейнасці вучэбна-метадычных аб'яднанняў — да 300 %. За арганізацыю ўдзелу навучэнцаў у рэгіянальных, рэспубліканскіх грамадска значных мерапрыемствах і суправаджэнне іх на гэтыя мерапрыемствы — да 150 %. За кансультаванне інавацыйных праектаў, што рэалізуецца на базе ўстановы адукацыі, — да 200 %. За суправаджэнне навучэнцаў на адукацыйныя мерапрыемствы, якое доўжыцца больш як суткі, — да 250 %.

Памер надбаўкі педагагічным работнікам з прафесарска-выкладчыцкага складу за кураратарства вучэбнай групы можа дасягаць 300 % ад тарыфнай стаўкі першага разраду, за распрацоўку вучэбна-праграмнай дакументацыі на замежнай мове — 400 %, за арганізацыю навукова-даследчай работы навучэнцаў — 200 %, за работу з замежнымі навучэнцамі — 200 %, за работу па ўзаемадзеянні з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў — 200 %.

Надбаўкі могуць устанаўлівацца па адной ці некалькіх падставах. Пры ўстанаўленні надбавак па некалькіх падставах яны падсумоўваюцца. Канкрэтныя памеры надбавак устанаўліваюцца загадам кіраўніка бюджэтнай арганізацыі па ўзгадненні з прафсаюзам на падставе палажэння аб надбаўках педагагічным работнікам, якое зацвярджаецца кіраўніком бюджэтнай арганізацыі.

У Міністэрстве адукацыі лічаць, што гэта мера дасць магчымасць павысіць заработную плату педагогам, а таксама забяспечыць дыферэнцыраваны падыход да аплаты працы педагагічных работнікаў з улікам аб'ёму, складанасці і выніковасці іх працы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# Люты стартуе адлігай

## Тэмпературны фон будзе ў асноўным на 5—9 градусаў вышэй за кліматычную норму

**У выхадныя атмасферныя франты, якія ссоўваюцца з поўдня Еўропы, прынясуць новую порцыю цяпла і вільгаці.**



Ападкі будуць выпадаць у асноўным у выглядзе дажджу, што ў спалучэнні са станоўчымі тэмпературамі прывядзе да раставання снегу, і ў паўднёва-заходніх раёнах краіны снег растане, а на астатняй тэрыторыі значна паменшыцца, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У першы дзень лютага чакаецца на большай частцы тэрыторыі краіны дождж і мокры снег, у асобных раёнах наліпанне мокрага снегу. Месцамі чакаецца туман, галалёд, дарогі будуць слізкімі. Тэмпература паветра будзе ў межах ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла. У выхадныя дні надвор'е ў краіне будуць вызначаць атмасферныя франты і цёплыя паветраныя масы міжземнаморскага паходжання.

Кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу чакаюцца і ў суботу на большай частцы тэрыторыі краіны. Месцамі туман, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 3 марозу да 2 цяпла, удзень — ад нуля да плюс 6 градусаў. У нядзелю часам чакаецца дождж. Месцамі туман, уначы на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература ўначы чакаецца ад мінус 1 градуса да 4 цяпла, удзень — ад нуля да плюс 7 градусаў.

У панядзелак і аўторак таксама будзе анамальна цёплае надвор'е. У першы дзень тыдня пад уплывам франтальнага раздзелу месцамі, пераважна на паўночным захадзе краіны, пройдуць дажджы. У асобных раёнах туман, уначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы будзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла, удзень чакаецца 1—6 вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у сярэдзіне наступнага тыдня з паўночна-заходнімі патокамі ў атмасферы на тэрыторыю краіны пачне паступаць больш халодная паветраная маса скандынаўскага паходжання. Пахаладае.

**Сяргей КУРКАЧ.**

На слыху

## Чарговыя ахвяры вадкасці-забойцы...

**У Мсціслаўскім раёне ад атручэння невядомай вадкасцю памерлі двое мужчын, яшчэ двое знаходзяцца ў бальніцы.**

Чацвярых мужчын у коме невыразнай этыялогіі ў розны час сутак яшчэ 20 студзеня брыгада хуткай дапамогі даставіла ў бальніцу Мсціслава. Пазней высветлілася, што напярэдадні адзін з іх знайшоў неўстаноўленую вадкасць у пяцілітровай каністры, якую на наступны дзень ужылі сумесна з трыма знаёмымі. 21 студзеня двое мужчын памерлі. Згодна з папярэднім заключэннем эксперта, смерць наступіла ў выніку вострага атручэння неўстаноўленым рэчывам.

Нагадаем, нядаўна ад атручэння светла-блакітнай вадкасцю таксама з пяцілітровай каністры памерлі двое мужчын у Барысаўскім раёне. Напярэдадні муж з жонкай і іх прыяцель ужывалі яе ў адной з вёсак. Жанчына знаходзіцца ў рэанімацыі з прыкметамі атручэння метылавым спіртам.

## «Мініравалі» школы ў Гомелі і Гродне

**Больш за сто чалавек былі эвакуяваны са школы ў Гомелі з-за пагрозы мініравання.**

У аператыўна-дзяжурную службу Чыгуначнага РАУС паступіла інфармацыя ад адміністрацыі сярэдняй школы № 55: на сайце навучальнай установы невядомы пакінуў паведамленне з пагрозай. У тэксце гаварылася, што ў школе закладзена выбуховае ўстройства. Яго прывядуць у дзеянне ў выпадку атрымання адмоўных адзнак па выніках кантрольнай работы. Па інфармацыі афіцыйнага прадстаўніка УУС Гомельскага аблвыканкама Віталя Прыстромава, са школы былі эвакуяваны 112 чалавек. У выніку праверкі з удзелам службовага сабакі выбуховыя ўстройствы не былі знойдзены.

У гэты ж дзень паступіла ілжывае паведамленне і аб мініраванні навучальнай установы ў Гродне. Як устанавілі супрацоўнікі міліцыі, такую інфармацыю праз сацыяльныя сеткі распаўсюдзіў навучэнец адной з навучальных устаноў абласнога цэнтра.

Навучэнцы і педагагічны калектыў былі аператыўна эвакуяваны.

Па інфармацыі афіцыйнага прадстаўніка УУС Гродзенскага аблвыканкама Ігара Белазёрава, выбуховых устройстваў не знойдзена.

Гродзенскі міжраённы аддзел Следчага камітэта завёў крымінальную справу па факце заведама ілжывага паведамлення аб небяспецы ў адносінах да 16-гадовага жыхара Гродна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# А КРЭДЫТ ВАМ МОГУЦЬ І НЕ ДАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ваша права на атрыманне своечасовай, неабходнай і дакладнай інфармацыі замацавана заканадаўча. Банк да заключэння крэдытнага дагавора абавязаны пададаць вам у пісьмовым выглядзе пад подпіс уніфікаваную інфармацыю аб умовах крэдытавання.

Дарэчы, інфармацыя аб умовах крэдытавання даецца банкамі бясплатна, а подпіс заяўнікам інфармацыі аб умовах крэдытавання не з'яўляецца заключэннем крэдытнага дагавора і не азначае ўзнікнення якіх-небудзь абавязацельстваў у кліента.

## Пагасіць крэдыт можна заўсёды

Вяртанне крэдыту і аплата працэнтаў за карыстанне ім могуць ажыццяўляцца рознымі спосабамі. Працэнты за карыстанне крэдытам вызначаюцца зыходзячы з фактычнага астатку запазычанасці за фактычны час карыстання ім. Парадак разліку плацяжоў варта вывучыць да заключэння крэдытнага дагавора.

А цяпер новае. Крэдыт на спажывецкія патрэбы кліент мае права вярнуць датэрмінова, без апавяшчэння банка. Пры гэтым неабходна выплаціць працэнты за фактычны тэрмін карыстання крэдытам.

## Адмова ў выдачы крэдыту

Пры выдачы крэдыту ацэнка крэдытаздольнасці заяўніка вядзецца на падставе шматфактарнага аналізу. Спецыялістамі ацэньваецца заяўлены кліентам узровень атрыманых даходаў, магчымасць своечасова рабіць рэгулярныя плацяжы ў пагашэнне крэдытаў і працэнтаў за карыстанне ім у адпаведнасці з умовамі крэдытнага дагавора. Акрамя таго, вывучаецца ваша крэдытная гісторыя.

Пры выдачы крэдыту на спажывецкія патрэбы банк павінен выкарыстоўваць паказчык пазыковай нагрузкі (ППН). Названы паказчык — суадносна крэдытных выплат да даходу ў месяц — не павінен перавышаць 40 працэнтаў.

Пры прадастаўленні крэдыту на фінансаванне нерухомасці банк павінен выкарыстоўваць у тым ліку паказчык забяспечанасці крэдыту (ПЗК). Згаданы паказчык размяшчаецца як працэнтныя суадносіны сумы крэдыту да кошту аб'екта нерухомасці, які прымаецца ў заклад у якасці забеспячэння, і (або) сумы іншага забеспячэння ў адпаведнасці з дагаворам. Названы паказчык не павінен перавышаць 90 працэнтаў.

Перавышэнне ўстаноўленых паказчыкаў можа быць прычынай адмовы ў выдачы крэдыту. І яшчэ. Банкі маюць права адмовіцца ад заключэння дагавора пры наяўнасці сведчанняў аб тым, што выдадзеная чалавеку сума крэдыту не будзе вернутая ў тэрмін.

У выпадку адмовы ад заключэння крэдытнага дагавора банкам рэкамендавана даступна, аргументавана і кампетэнтна растлумачыць заяўнікам прычыны прыняцця адмоўнага рашэння аб выдачы крэдыту. Як правіла, раней банкі адмаўлялі без тлумачэння прычын.

## Нацыянальны банк папярэджвае

Заканадаўствам вызначаны існуючыя ўмовы крэдытнага дагавора, якія абавязкова павінны ў ім прысутнічаць. Фінансавы рэгулятар нагадвае, якія менавіта. Гэта:

— аб суме крэдыту;

— аб тэрміне і парадку выдачы і вяртання крэдыту;

— аб памеры працэнтаў за карыстанне крэдытам і парадку іх аплаты;

— аб адказнасці крэдытора і крэдытаатрымальніка за невыкананне (неналежнае выкананне) імі абавязацельстваў;

— іншыя ўмовы, адносна якіх па заяве аднаго з бакоў павінна быць дасягнута згода.

Пры вызначэнні ў крэдытным дагаворы парадку выдачы і вяртання крэдыту банк абавязаны прапанаваць адзін са спосабаў выдачы і вяртання крэдыту, якія ажыццяўляюцца бясплатна.

## Каму павінен і колькі?

Устаноўлена забарона на спагнанне банкамі якіх-небудзь дадатковых плацяжоў (камісійных і іншых узнагароджанняў) за карыстанне крэдытам. Гэта значыць, што выдаткі, звязаныя з выдачай і вяртаннем крэдыту, банк павінен уключаць у працэнтную стаўку (напрыклад, выдаткі банка па разглядзе дакументаў, суправаджэнні крэдыту, выпуску і абслугоўванні дадатковай карткі і іншыя).

Зараз кліент банка мае права атрымліваць па запыце інфармацыю аб сваёй запазычанасці па крэдытным дагаворы па меншай меры адзін раз у месяц бясплатна. Такой інфармацыяй з'яўляюцца звесткі аб суме запазычанасці па крэдыце ў частцы асноўнай сумы доўгу, працэнтах за карыстанне ім, а таксама ў частцы пратэрмінаванай запазычанасці.

Дык вось, пры ўзнікненні пратэрмінаванай запазычанасці па крэдытным дагаворы банк абавязаны інфармаваць крэдытаатрымальніка ў тэрмін не пазней за 30 дзён са дня яе ўтварэння. І гэта банкі павінны рабіць бясплатна.

Кожны чалавек павінен улічваць, што Нацбанк не мае паўнамоцтваў на ўмяшанне ў дагаворныя адносіны паміж фінансавымі інстытутамі і кліентамі.

Таму важна, каб самі крэдытаатрымальнікі фінансава кампетэнтна ставіліся да заключэння крэдытнага дагавора з банкам. Трэба памятаць, што, падпісаўшы крэдытны дагавор, вы згаджаецеся з усімі яго ўмовамі і прымаеце на сябе абавязацельства па іх выкананні.

**Сяргей КУРКАЧ.**